

**Тамара Міхайлаўна МАЗУР** нарадзілася 30 лістапада 1964 года ў вёсцы Лазы Ваўкавыскага раёна. Паля заканчэння Роскай сярэдняй школы працавала ў Гродзенскай узбуйненай друкарні. Закончыла факультэт журналістыкі БДУ. З 1988 года -- на журналіскай працы ў рэдакцыях газет «Прамень» і «Чырвоная змена», часопісах «Першацвет» і «Крыніца», ваўкавыскай газеце «Наш час». Цяпер – загадчык аддзела па асноўных накірунках дзейнасці ў Гродзенскай рэгіянальнай газеце «Перспектива». Жыве ў г. Гродна. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аўтар кнігі «Спакуса траўня» (1995 г.) З'яўляецца укладальнікам і сааўтарам паэтычных зборнікаў «Дзе расце сон-трава» (2002 г.), «Ваўкавыск – радзімка Беларусі» (2005 г.). Вершы і паэмы друкаваліся ў газетах «ЛіМ», «Чырвоная змена», «Рэспубліка», «Народная газета», часопісах «Першацвет», «Маладосць».

## *Свята ў Гародні**

**Кожны дзень у Гародні –**

**дар вялікі Господні.**

Тут лячуся душою між сваіх землякоў,

Карані ўглыб пускаю
і ў раздоллі гушкаю
Свае думкі без межаў і ніякіх акоў.

У Швейцарскай даліне
даўні смутак пакіну
Абмываць у рачулцы, што цячэ тут здавён.
З маладым Жыліберам
пабратаюся ў веры,
Да якой праз стагоддзі далучыў мяне ён.

Гэта вера ў Гародню,
што на Крэсах Усходніх
Не скарылася волі ні паноў, ні гаспод.
І сягоння шыкоўна
ў шматгалоссі прыстойным
Зноў сабрала на свята беларускі народ.

Шмат падворкаў. И ў рома
без спачынку і стомы
Ў віхры танцаў – цыгане, жар качэўнай любві!
І гуляе, не стыне
ў беларускіх грузінаў
Тэмперамент усходні – у гарачай крыві.

Ля анёла, на ганку
ў рытме – свет індыянкі,
Зачарованы ёю гаспадар не адзін.
Тут свае маюць дзеі
Украінцы, яўрэі.
Запрашаюць да кухні рускі і армянін.

І паўсюль – цуд рамёстваў:
рэчаў зроблена мноства –
Цешаць, вабяць і просяцца іх для дома набыць.
Эх, Гародня цудоўная,
беларуская, родная!
І чаго нам журыцца? Час – пажыць, не тужыць.

* У Гродне праз гожныя два гады праводзіцца фестываль нацыянальных культур Беларусі.

**Запавет**

Не прадаць, не зганьбіць, не пакінуць
Роднае і крэўнае ў бядзе.
Запавет такі рыхтую сыну,
Каб сабе не здрадзіў між людзей.

Мала выпадковую падкову
Над дзвярыма новымі прыбіць.
Сынку, гэта так недастаткова
Не згубіць, не ўкрасці, не ўгнявіць.

Мала не судзіць, не спакушацца,
Бо й манахі грэшнымі былі.
Так патрэбна вольным называцца
На святой ад прадзедаў зямлі.

Мой ты сынку, ни сцягі, ні зоркі
Не гартуюць гэтак пачуццё,
Як да родных дзедаўскіх узгоркаў
Хіліцца пяшчотаю жыццё.

Благаслаўляю ў шлях цябе нялёгкі,
Дзе лаўровы не дадуць вянок.
Дый навошта ён нашчадку з вёскі,
Іншы табе трэба, мой сынок.

Той, які каханая жанчына
Жартам пакладзе на валасы.
Хай табе заўсёды напамінам
Будуць Беларусі галасы.

Мала на руках не мець аковаў.
Што з той волі, як душа маўчыць?
Трэба любай беларускай мовай,
Як бясцэнным дарам даражыць.

Больш жадаць нічога не бяруся.
Многа – без граху і без спакус.
Мала нарадзіцца беларусам,
Трэба, сын мой, ЖЫЦЬ, ЯК БЕЛАРУС.

**Пабудзь са мной...**

Пабудзь са мной яшчэ, мой сябра,
Хіба не чуеш, як для нас
Гуляе ў песнях вольны табар,
І як раскошна сцеле час.

Да вуснаў вусны прыпадаюць,
Да цела – цела, як раманс.
Два сэрцы вольныя не знаюць,
Што дзесьці ў свеце ёсць падман.

З табой знайшла, здаецца, шчасце.
Не трэба крылаў, крылы – свет,
Які ратуе ад напасцей
Наш таямніча-просты след.

Наш след з табою. Ён – у справах,
Ва ўчынках, словах... У вачах
Тваіх чытаю мудрасць, славу
І дум аб будучым размах.

Мне добра мець з табою мэту
Адну, як востраў, на дваіх.
І, не чакаючы да лета,
Рабіць грачым кожны міг.

**Існасць**

Лермантаў, Купала, Пастарнак....
Мне душу радком далечным лечаць.
Я ж сама не вынайду ніяк
Выхад з кола непатрэбных рэчаў.

Непатрэбны гонар і прэстыж,
Непатрэбны гучныя пасады.
Ёсць сям’я і дом мой... А Парыж
Ці Стакгольм – часовая прынада.

Ёсць сяброўкі, верныя сябры
Тут, у церпялівай Беларусі.
Тут, дзе думы гушкаюць бары,
Ні на кога з хціўцаў не злуюся.

Кожнаму – сваё, з усімі – Бог.
І не праўда – ён пароўну дзеле:
Некаму ж багацце як астрог,
І высокі чын -- вугор на целе.

У мяне – ні грошай, ні чыноў,
Проста так сама ў сабе варуся.
За свайго і за чужых сыноў
Кожны вечар перад сном малюся.

***

Пагуляла ў шпацыр і досыць:
Не такая я пані-цацка!
Маё сэрца пяшчоты просіць
І звычайнай мужчынскай ласкі.

Мая постаць жадае строяў,
Што не ціснуць, не замінаюць.
Мае думкі вясновым мрояць
І ніякіх межаў не знаюць.

Эх, былі-не былі турботы –
Сэрца хоча тварыць санеты!
Пачакае крыху работа –
Не заўжды ў нас пяюць паэты.

Вольнадумства – не вераломства.
Ёсць папера – яна стрывае.
А чыясьці за нешта помста –
Як жабрачка вясны не мае.

***

Адбыцца – у стане палёту
Паміж вельмі рэдкіх сустрэч,
І зведаць сапраўднае – хто ты,
Сумненні адкінуўшы прэч.

І вусны, і рукі, і... цела
Твае далучыць да сваіх.
Пачуццямі шчырымі смела
Ўвесь свет карыстаць – на дваіх.

Адбыцца – у думках наросхрыст,
Якія прымаць ты гатоў.
Адбыцца – так лёгка і проста,
Без лішніх бяссэнсавых слоў.

***

Мяне зберагла прырода
Вядомаю Богу цаной.
Ты лепіш з мяне асалоду,
Ты робіш мяне зямной.

Ты чуйна ловіш дыханне
І думак зменлівых ход...
Я волю даю жаданням –
Крышу свой апошні лёд.

Звеш ты мяне дзяўчынкай:
Бальзакаўскі ўрост – далоў!
З-за лішняй маёй слязінкі
На подзвіг уміг гатоў.

Але не трэба змаганняў –
Мяне ж ты вольнай знайшоў!
З табой я расту ў каханні.
З табою жыву душой.

***

У вачах тваіх бачу смутак,
І ніяк ты яго не схаваеш.
Ў іх – магутнай энергіі згустак,
Ўсё таму, што мяне *кахаеш.*

У вачах тваіх – жаль пяшчоты,
Ад таго, што набыў і губіш,
Забываеш на непагадзь, слоту...
Ўсё таму, што мяне ты *любіш.*

У вачах тваіх – знічкі шчасця,
І за іх ты мяне цалуеш,
Бог даруе табе багацце,
Ўсё таму, што мяне *шануеш.*

**Важней кахання**

А што было важней кахання –
Крынічкі чыстай пачуцця?
Важней за ўсё было чаканне
Народзін новага жыцця.

Важней за ўсё было цвіценне
Пяшчоты ў патаемны час,
Калі прыходзіла натхненне,
Каб пamірыць няверных нас.

Важней было не ўпасці духам,
Каб уцалеў, ажыў паэт.
Каб жаль жалобы або скруха
Не зацямнілі белы свет.

Важней за ўсё было маленне
У кут загнанае душы,
І покліч чыйсці ў час здранцвення:
Ўставай, змагайся і пішы.

Важней было апроч кахання
Пражыць жыццё сваё наўздзіў.
І мець святое дараванне
Да тых, хто ганьбіў і судзіў.

***Ці праўда, сяброўка?***

Ці праўда, сяброўка, зайздросціш ты мне,
Што зараз жыву я ў Гародні?
А мне і самой падаецца бы ў сне
Адроджаны горад заходні.

На гулкім памежжы з суседкай Літвой
І Польшчай, што іншаю стала,
Пануе на дзіва спакусны спакой
І йграюць легендаў цымбалы.

Унёсак мой сціплы, як след мае быць,
Упішацца ў важкі парадак.
Карэнны жыхар паспрыяе забыць

Мінулых бадзянняў асадак.

**Пашпарт: МС 0570869 выдадзены Стаўбцоўскім РАУС Мінскай вобласці 19.04.2000 г.**
**Адрас: 230000, вул. Брыкеля, д. 7, к. 216, г. Гродна.**
**Тэлефоны: (8-0152) 75-71-84, 75-70-62. МТС: 2881317, Velkom: 9768999.**